# Пасяджэнне Савета па праектах у сферы лічбавага развіцця ў абноўленым складзе – якія лічбавыя рашэнні атрымалі падтрымку?

На чарговым пасяджэнні Савета па праектах у сферы лічбавага развіцця разгледжаны пул прапанаваных праектаў на наступны перыяд.

У фокусе ўвагі пытанні:

- мадэрнізацыя інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры на мяжы з акцэнтам на падтрымку палітыкі «лічбавага суверэнітэту»;
- фарміраванне сістэмы падтрымкі прыняцця рашэнняў у сферы масавай інфармацыі.

Пры гэтым, як адзначыў старшыня Савета – Міністр сувязі і інфарматызацыі Кірыл Залескі:

«Праекты на будучы перыяд павінны адбірацца з захаваннем разумнага балансу: задача – не імкнуцца да татальнай аблічбоўцы ўсіх працэсаў, а забяспечыць эфектыўныя пераўтварэнні з дапамогай «лічбы» для насельніцтва і эканомікі. У гэтых мэтах у кароткі тэрмін будуць перагледжаны крытэры, па якіх будуць адбірацца будучыя праекты з максімальным арыенцірам на людзей».

Акрамя лічбавых праектаў на будучы перыяд, члены Савета разгледзелі актуальныя прапановы Мінгарвыканкама і МЖКГ.

У выніку да канца бягучага года варта чакаць з'яўленне на платформе «разумны горад» сэрвісаў для атрымання ўсёй інфармацыі аб спартыўным жыцці сталіцы з магчымасцю падачы заявак на ўдзел у іх.

Інсайд: пасля распрацоўкі сервісу на базе горада Мінска ён будзе гатовы да ўкаранення ва ўсіх рэгіёнах краіны.

А яшчэ па выніках праектаў гэтага года грамадзяне і спецыялісты са сферы ЖКГ атрымаюць магчымасць дыстанцыйна:

- устаць/прыняць на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў;
- зарэгістраваць дагавор найму жылога памяшкання;
- узаемадзейнічаць па пытанні прадастаўлення арэнднага жылля;
- атрымліваць аператыўна актуальную інфармацыю аб жыллёвым фондзе.

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/pasyadzhenne-saveta-pa-praektakh-u-sfery-lichbavaga-razviccya-u-abnoulenym-skladze-yakiya*